УДК 719:06(476)"1991/2006"

# АДМІНІСТРАЦЫЙНЫЯ ПАДЫХОДЫ ДА АХОВЫ НЕРУХОМЫХ МАТЭРЫЯЛЬНЫХ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНЫХ КАШТОЎНАСЦЕЙ У 1991 – 2006 гг. (НА ПРЫКЛАДЗЕ ДЗЕЙНАСЦІ МІНСКАГА, МАГІЛЁЎСКАГА, ГОМЕЛЬСКАГА АБЛАСНЫХ ВЫКАНАЎЧЫХ КАМІТЭТАЎ)

***К.В. АНДРЭЙЧЫК***
***(Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт)***

*Разглядаецца практычны вопыт дзейнасці органаў дзяржаўнага кіравання абласнога тэрытарыяльнага ўзроўню па ахове нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей, выяўлена спецыфіка адміністрацыйна-эканамічных механізмаў аховы і рэалізацыі мерапрыемстваў па захаванні, утрыманні і рацыянальным выкарыстанні помнікаў прамысловай і грамадзянскай архітэктуры.*

***Ключавыя словы:*** *органы ўлады, заканадаўства, дзяржаўнае рэгуляванне, дзяржаўная палітыка, гісторыка-культурныя каштоўнасці.*

**Уводзіны.** З атрыманнем дзяржаўнага суверэнітэту ў Беларусі распачаўся доўгі працэс будовы нацыянальнай сістэмы аховы гісторыка-культурнай спадчыны, пад якой разумеецца комплекс адміністрацыйных, прававых і эканамічных мер, накіраваных на ўлік, захаванне, аднаўленне, утрыманне і выкарыстанне гісторыка-культурных каштоўнасцей. У законе ад 1992 г. "Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны" дзяржаўная палітыка вызначалася Вярхоўным Саветам Рэспублікі Беларусь, а рэалізоўвалася Саветам Міністраў праз спецыялізаваную інспекцыю па ахове гісторыка-культурнай спадчыны, на мясцовым тэрытарыяльна-адміністрацыйным узроўні рэалізацыя дзяржаўнай палітыкі ўваходзіла ў кампетэнцыю абласных выканаўчых камітэтаў. Планаванне, каардынацыя і кантроль былі замацаваны за профільнымі ўпраўленнямі, камітэтамі і дэпартаментамі, якія часта рэструктураваліся. Кіраўніцтва кожнай вобласці краіны абірала ўласны шлях аднаўлення нерухомых гісторыка-культурных каштоўнасцей.

**Асноўная частка.** Мінскі абласны выканаўчы камітэт, а таксама гарвыканкам пайшлі па шляху будовы бізнес-мадэлі ў аднаўленні гістарычнай часткі горада. Рашэннем ад 28 мая 1991 г. № 184 было створана ўпраўленне па кансервацыі і рэстаўрацыі помнікаў гісторыі і культуры Мінгарвыканкама. Ужо ў 1992 г. з мэтай прыцягнення сродкаў замежных інвестараў пачало працаваць акцыянернае таварыства адкрытага тыпу "Стары Менск", на якое былі ўскладзены задачы па будаўніцтве, рэканструкцыі і прыстасаванні помнікаў. Упраўленне па рэстаўрацыі і кансервацыі было скасавана. У якасці фундатараў выступілі Мінскі гарвыканкам і Галоўрэстаўрацыя, якія мелі кантрольны пакет акцый [1, л. 13; 2, л. 73]. Выканкам меў права валодання, карыстання і здачы ў арэнду забудовы тэрмінам на 49 гадоў без права іншых форм распараджэння. АТ "Стары Менск" падпісаў дамовы аб стварэнні двух сумесных прадпрыемстваў з фірмамі Італіі і Вялікабрытаніі для рэканструкцыі і далейшай эксплуатацыі шасці будынкаў, будаўніцтва гатэля і ратушы. Памер інвестыцый склаў 22 млн $. Усе затраты на рэканструкцыю і прыстасаванне неслі замежныя партнёры, а прыбытак размяркоўваўся ў роўнай прапорцыі. Такім чынам, была ўведзена мадэль акцыянавання аднаўленчых работ у цэнтрах гістарычнай забудовы з умовай захавання дзяржаўнай уласнасці на будынкі. Ужо ў 1991 г. былі распачаты работы па рэстаўрацыі раёна гістарычнай забудовы "Верхні горад" і прыстасаванні яго для размяшчэння ўстаноў і арганізацый культуры, гандлю, турызму, грамадскага харчавання. Агульны кошт праекта склаў 450 млн руб. Работы праводзіліся па вул. Інтэрнацыянальнай, на пл. Свабоды, д. 19, 23 і гарадской ратушы. У 1993 г. завяршылася рэканструкцыя будынка дзіцячай музычнай школы, музея гісторыі мастацтва, распачата будаўніцтва па вул. Інтэрнацыянальнай, Герцэна. У ходзе рэстаўрацыйных работ у 1990 – 2000-х гг. было цалкам адноўлена першапачатковае аблічча Сабора Найсвяцейшага імя Прасвятой Дзевы Марыі, у якім ў 1990-х гг. знаходзіўся "Дом фізкультурніка". У 1993 г. храм вярнулі каталіцкай царкве, у 1997 г. ён быў паўторна асвечаны. Знакавай падзеяй у рэвіталізацыі гістарычнай спадчыны Мінска стала будаўніцтва сімвала гарадскога самакіравання – ратушы, якая была знесена яшчэ ў 2-й палове XIX ст. У 2002 – 2004 гг. пад кіраўніцтвам архітэктара С. Багласава праводзілася ўзвядзенне будынка гарадской ратушы. На першым паверсе размешчаны выставачныя залы для экспазіцыі музея Мінска. У вялікай экспазіцыйнай зале ўсталяваны макет гістарычнага цэнтра горада пачатку XIX ст. пад шкляным купалам. На другім паверсе ратушы, дзе калісьці размяшчаўся магістрат, размяшчаецца зала для прыёма ганаровых гасцей і нарад. У 2004 г. дзверы ратушы адчыніліся для наведвальнікаў мастацкіх экспазіцый. Прылеглы да будынка сквер таксама быў рэканструяваны [2, л.76].

Горадабудаўнічае планаванне развіцця тэрыторый сталіцы рэалізоўвалася ў межах генеральнага плана, "Плана функцыянальнага выкарыстання Мінска". У 2004 г. Прэзідэнтам быў прыняты Указ № 330 "Аб развіцці гістарычнага цэнтра г. Мінска". Буйныя тэмпы ўрбанізацыі вымагалі ад уладаў планаваць умовы для ажыццяўлення гаспадарчай і іншай дзейнасці, ствараць сістэмы інжынернай, транспартнай інфраструктуры, ажыццяўляць добраўпарадкаванне. Увага была скіравана на гістарычны цэнтр Мінска – "Верхні горад" з прылеглымі кварталамі ў межах вуліц Інтэрнацыянальнай – Гарадскога Вала – Нямігі – Ракаўскае і Траецкае прадмесці і тэрыторыя Мінскага замчышча, асноўная частка якога прымыкае да

р. Свіслач паміж вуліцай Багдановіча і Палацам спорту. З канца 1980-х гг. доўжылася рэстаўрацыя асабняка дваранскага і шляхецкага роду Ваньковічаў па вул. Інтэрнацыянальнай, 33А. У 2000 г. да 200-годдзя з дня нараджэння мастака музей быў адкрыты. Да гэтай даты было прымеркавана адкрыццё ў сядзібным доме пастаяннай экспазіцыі, якая дае магчымасць пазнаёміцца з працамі В. Ваньковіча і культурай беларускай сядзібы 1-й паловы XIX ст. Была адноўлена і сама сядзіба: пабудаваны флігель кіраўніка, брама, усталяваны помнік В. Ваньковічу.

У 2004 г. было ўтворана камунальнае будаўніча-эксплуатацыйнае ўнітарнае прадпрыемства "Мінская спадчына". Заснавальнікам з'яўляўся Мінскі гарадскі выканаўчы камітэт. Галоўныя мэты прадпрыемтсва: рэканструкцыя, рэстаўрацыя аб'ектаў камунальнай уласнасці, размешчаных у кварталах гістарычнай забудовы "Верхні горад", "Ракаўскае прадмесце" і "Траецкае прадмесце"; прыстасаванне аб'ектаў для размяшчэння офісаў, гадлёвых кропак, турыстычнай інфраструктуры, пошук новых інвестараў і партнёраў для рэалізацыі інвестыцыйных праектаў; кіраванне і здача ў арэнду, эксплуатацыя і ўтрыманне будынкаў. У адпаведнасці з рашэннем Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта ад 29 снежня 2005 г. № 2320 з мэтай забеспячэння захаванасці нерухомай маёмасці камунальнай уласнасці арэндадаўца павінен быў страхаваць арандаваную нерухомую маёмасць, а сродкі, атрыманыя па страхавой кампенсацыі, выкарыстоўваліся на рамонт арандаванай маёмасці. У 2000 г. уладамі было прынята рашэнне аб прыстасаванні былых карпусоў мужчынскага манастыра бернардзінцаў да патрэб гатэлю ("Манастырскі"), аднак працы былі праведзены ў 2009 – 2014 гг. 15 красавіка 2004 г. было прынята рашэнне аб аднаўленні гасцініцы "Еўропа". Першых пастаяльцаў гасцініца прыняла ў 2007 г. [3].

Яшчэ адным прыкладам прыцягнення сродкаў інвестараў стала ўтварэнне ў 1991 г. сумеснага беларуска-польскага прадпрыемства "Рэнаватум" (было ліквідавана ў 2014 г.). Міністэрства культуры выступіла заснавальнікам. Падобны вопыт быў пераняты ў Гродзенскай вобласці [4] Мэтай прадпрыемства было ажыццяўленне дзейнасці ў галіне аднаўлення, рэстаўрацыі, выкарыстання помнікаў гісторыі і культуры, каштоўнасцей і навакольнага асяроддзя, экскурсійна-турыстычнага і гандлёвага абслугоўвання на аснове падзелу працы і кааперацыі, аб'яднанне намаганняў і сродкаў у навукова-тэхнічным, вытворчым, сацыяльным развіцці. Прадпрыемства займалася распрацоўкай навукова-даследчай, праектнай, каштарыснай дакументацыі помнікаў гісторыі і культуры і аб'ектаў новага будаўніцтва; навуковымі, тэхнічнымі, фізіка-хімічнымі, мікрабіялагічнымі даследаваннямі; распрацоўкай тэхналогій; патэнтавай справай; кансервацыйнымі, рэстаўрацыйнымі, мастацкімі, будаўнічымі работамі; камерцыйнай, асветніцкай, інфармацыйнай дзейнасцю на тэрыторыі краін-удзельніц і ў іншых краінах; стварэннем сістэмы культурнатурыстычных комплексаў і паслуг і іх выкарыстаннем; аказаннем паслуг з правам арэнды; будаўніцтвам, пакупкай і эксплуатацыяй гасцініц, транспартных сродкаў; аказаннем экскурсійна-турыстычных паслуг; прыняццем на баланс помнікаў гісторыі і культуры, стварэннем прадпрыемстваў будаўнічай індустрыі, вырабам інструментаў, абсталявання, матэрыялаў для выканання работ [5, л. 98].

Доля міністэрства ў фондзе прадпрыемства складала 28%. Аднак Закон "Аб уласнасці" забараняў Міністэрствам выступаць у якасці заснавальніка суб'ектаў гаспадарання недзяржаўнай формы ўласнасці. Таму ў 1996 г. Міністэрства культуры заявіла аб выхадзе са складу заснавальнікаў і перадала свае правы і долю маёмасці падведамаснай арганізацыі – Нясвіжскаму Нацыянальнаму гісторыка-культурнаму запаведніку. Паўнавартаснымі партнёрамі былі арэнднае прадпрыемства "Беларускі рэстаўрацыйна-праектны інстытут", арэнднае прадпрыемства "Мінскае абласное рэстаўрацыйнае ўпраўленне", з польскага боку – Дзяржаўнае прадпрыемства "Майстэрні па рэстаўрацыі помнікаў даўніны", Фонд культуры Рэспублікі Польшча. Агульная колькасць сродкаў статутнага фонду ад Рэспублікі Беларусь склала 64%. Польскім бокам была праведзена рэстаўрацыя былога заезнага двара, ратушы, асобных будынкаў гістарычнай забудовы горада [5, л. 75]. Архіўныя крыніцы сведчаць аб частых выпадках парушэння ахоўнага заканадаўства. Даволі "пакутлівым" аказаўся "Верхні горад". Абранне камерцыйнага шляху засваення тэрыторыі прывяло да страты часткі гістарычнай забудовы. У выніку праверак Пракуратурай было высветлена, што мелі месца парушэнні ў працэдуры выдачы зыходна-дазваляльных дакументаў, узгадненні праектна-каштарыснай дакументацыі на рэстаўрацыйныя і іншыя работы. Сітуацыя была абцяжарана адсутнасцю зацверджанага спіса аб'ектаў, якія падлягалі ахове і, як вынік, поўнай немагчымасцю прыцягнення віноўных да адказнасці. Напрыклад, было выяўлена, што кіраўніцтва Камітэта па рэстаўрацыі і кансервацыі помнікаў гісторыі і культуры аднаасобна прымала рашэнні аб правядзенні работ без узгаднення з навукова-метадычнай Радай, напрыклад, па помніку архітэктуры і горадабудаўніцтва рэспубліканскага значэння па вул. Герцэна, 2а (тэрыторыя "Верхняга горада"). У 1997 г. аўтэнтычны помнік быў разабраны, а на яго месцы з'явілася навабудоўля. У ходзе праверак была выяўлена праектна-каштарысная дакументацыя не на аднаўленне і рэстаўрацыю, а на новае будаўніцтва. З грубым парушэннем закона вяліся работы па рэканструкцыі будынкаў па вул. Інтэрнацыянальнай, д. 31,31а, 33, 33б. Перад пачаткам работ не былі праведзены даследаванні манументальнага жывапісу і інтэр'ераў. ААА "Трайпл", з'яўляючыся ўласнікам д. 10 у "Ракаўскім прадмесці", атрымаў узгадненне на работы, у выніку помнік страціў аўтэнтычнасць і атрымаў прыбудовы. Неаднаразова эксперты падкрэслівалі, што правядзенне праектна-рэстаўрацыйных работ у гістарычным цэнтры Мінска адбываліся не ў адпаведнасці з зацверджаным горадабудаўнічым праектам рэканструкцыі ўсяго "Верхняга горада", канцэпцыі рэканструкцыі і прыстасавання, праектаў новага будаўніцтва, добраўпарадкавання тэрыторыі і інжынернага забеспячэння. Рэканструкцыя і прыстасаванне помнікаў сталі служыць інтарэсам камерцыі,

у выніку выдаваліся дазволы і помнікі зносіліся, аднаўляючыся з новых матэрыялаў. Акты праверак Пракуратуры сведчаць, што ў 1998 г. без узгаднення з Навукова-метадычнай радай Камітэтам былі выдадзены дакументы па аб'ектах: Палац Румянцавых-Паскевічаў, Гарадская Ратуша ў Нясвіжы, Ратуша з гандлёвымі радамі ў Шклове. У 1994 г. быў адобраны праект па разборцы і аднаўленні будынкаў на пл. Свабоды № 19, 21 нанова. Будынкі былі знесены, новыя пабудовы прыстасавалі для кропак харчавання, гандлю, паслуг. У 1994 г. знеслі будынак (жылы дом XVIII – XX стст.) па вул. Інтэрнацыянальнай, 5, на яго месцы пабудавалі гатэль "Еўропа". Па ацэнцы Пракуратуры былі знішчаны помнікі па вул. Інтэрнацыянальная, 25, Герцэна, 6, Вызвалення, 5, вул. Камсамольская дд. № 5, 7, 9, 16. Помнікі былі знесены, а ўзведзеныя новабудоўлі аказаліся па памерах больш за былыя. Уласнікі аб'ектаў хацелі атрымаць ільготы на праектныя ці рэстаўрацыйныя работы, аднак з-за страты аўтэнтычнасці помнікі страчвалі свае ўласцівасці каштоўнасцей.

Інтэнсіўнае бізнес-засваенне гістарычнага цэнтра горада вымушала мясцовыя улады прымаць экстраардынарныя рашэнні з мэтай развіцця інфраструктуры. Вострай крытыцы падвяргалася рэалізацыя праекта ўзвядзення шматузроўневай паркоўкі на вул. Няміга, якая павінна была вырашыць праблему недахопу парковачных месцаў, у сувязі з будаўніцтвам новых аб'ектаў у гэтай частцы горада [6, с. 3].

Акты праверак фіксавалі парушэнні ахоўнага заканадаўства па Мінскай вобласці [7, л. 162]. Да прыкладу, на тэрыторыі гісторыка-культурнага запаведніка "Заслаўль" пад пагрозай апынуліся нерухомыя каштоўнасці (X, XI, XVII, XVIII стст.). Заслаўскім выканкамам ў 1997 г. было падпісана ахоўнае абавязацельства ў дачыненні да ўсіх каштоўнасцей, акрамя Спаса-Праабражэнскай царквы. Мясцовымі ўладамі без правядзення даследчых работ, узгаднення дакументацыі было прынята рашэнне аб пачатку работ па рэканструкцыі пажарнага вадаёму, праектавання рэканструкцыі ёмістасці для захоўвання нафтапрадуктаў на тэрыторыі гісторыка-культурнай каштоўнасці "Гістарычны цэнтр Заслаўля". Без дазволу былі пабудаваны ёмістасці нафтабазы, дарожная інфраструктура. Без увагі мясцовых улад застаўся помнік археалогіі X ст. "гарадзішча Замэчак". На помніку вялася некантралюемая гаспадарчая дзейнасць. Каля вала была ўзведзена лазня і іншыя шматлікія гаспадарчыя і жылыя пабудовы. Лазня была знесена толькі пасля вынясення прадпісання Пракуратуры. У паўночнай частцы на схіле гарадзішча знаходзіліся агароды жыхароў, вёўся выпас жывёлы. Аналагічныя парушэнні заканадаўства выяўлены пракурорскімі праверкамі ў Барысаўскім, Уздзенскім, Дзяржынскім раёнах [7, л. 165].

Рэстаўрацыю помнікаў архітэктуры і горадабудаўніцтва па Гомельскай вобласці курыравала камунальнае вытворчае ўнітарнае прадпрыемства "Гомельрэстаўрацыя", утворанае ў 1980 г. у структуры аблвыканкама. У канцы 1990 г. сумесна Гомельскім і Магілёўскім аблвыканкамамі пры ўдзеле Міністэрства культуры былі створаны камісіі па абследаванні тэхнічнага стану і распрацаваны мерапрыемствы па захаванні нерухомай спадчыны населеных пунктаў, якія пацярпелі ад аварыі на ЧАЭС. На тэрыторыі 10 раёнаў Гомельскай вобласці знаходзіліся 362 помнікі археалогіі, 97 помнікаў архітэктуры. Фінансаванне ажыццяўлялася за кошт сродкаў, якія вылучаліся на пераадоленне наступстваў аварыі ў адпаведнасці з Нацыянальнай праграмай пераадолення наступстваў чарнобыльскай катастрофы на 1993 – 1995 гг. і да 2000 г. За гэты час было выяўлена больш за 60 археалагічных аб'ектаў, вялася праца ў 12 з 16 пацярпелых раёнаў. З 1992 г. праводзілася экспертыза ўсіх архітэктурных помнікаў Веткаўскага і Гомельскага раёнаў, што дазволіла прадухіліць разбурэнне помнікаў. Праекты зон аховы распрацоўваліся ў Быхаўскім, Касцюковіцкім, Клімавіцкім раёнах. Аднак з-за згортвання фінансавання былі скончаны работы ў шэрагу сядзібна-паркавых ансамбляў: у Нароўлі, в. Дзям'янкі (Добрушскі раён), в. Галоўчыцы (Нараўлянскі раён), в. Барысаўшчына (Хойніцкі раён). Прычынамі маруднага тэмпу аднаўлення было недастатковае развіццё рэстаўрацыйнай базы, тэхналогій дэзактывацыі помнікаў, недахоп спецыялістаў [8, с. 188].

У 1993 г. пачалася праца ў палацава-паркавым комплексе Козел-Паклеўскіх у Чырвоным Беразе (Жлобінскі раён). У1994 г. даследаваны стан помнікаў драўлянага дойлідства. За кошт дзяржаўнага фінансавання, мясцовага бюджэту, дапамогі прадпрыемстваў былі адноўлены будынак ратушы ў Чачэрску, помнік драўлянага будаўніцтва ў Нароўлі з прыстасаваннем пад музеі. За кошт мясцовага бюджэту адноўлена Праабражэнская царква ў Чачэрку. У 2003 г. за кошт рэспубліканскага бюджэту быў скончаны першы этап рэстаўрацыі палаца Румянцавых-Паскевічаў, у адчыненым корпусе размясцілася экспазіцыя "Уласнікі Гомельскага Палаца Румянцавых-Паскевічаў". Мясцовыя органы ўлады ініцыіравалі збор сродкаў праз аб'яўленне латарэі і ў 2004 г. была праведзена рэстаўрацыя ляпнога дэкору галоўнага корпуса [7, л. 45]. Праводзіліся работы ў касцёле Прасвятой Тройцы ў Рэчыцы (1998 – 2006 гг.), Свята-Успенскім праваслаўным соборы (1999 – 2003 гг.), устаноўлены купал на царкве Усіх Святых у Тураве (2005 г.). Былі закансерваваны Палац Горватаў у Нароўлі, калегіум езуітаў у в. Юравічы (Калінкавіцкі раён), сядзібны комплекс Дарыа-Дзерналовічаў у Карме, сядзіба ў в. Хальч (Веткаўскі раён). Такім чынам, з пачатку 1990-х гг. ахова нерухомай спадчыны Гомельскай вобласці праводзілася па наступных кірунках: выяўленне і фіксацыя нерухомай спадчыны зоны, пацярпелай ад аварыі. Да ліку буйных аб'ектаў, на якіх былі праведзены рэстаўрацыйныя работы, адносяцца Палац Румянцавых-Паскевічаў у Гомелі, ратуша ў Чачэрску, рэстаўрацыя культавых будынкаў, кансервацыя сядзібных комплексаў [9; 10, л.143].

Тэмпы аднаўлення нерухомай спадчыны Магілёўскай вобласці у пач. 1990-х гг. адрозніваліся ад паказчыкаў па іншых абласцях. Гэта было выклікана неабходнасцю пераразмеркавання сродкаў абласнога бюджэта на ліквідацыю наступстваў ад аварыі на ЧАЭС. Радыёактыўнаму забруджванню падверглася 14

раёнаў Магілёўскай вобласці: Бялыніцкі, Бабруйскі, Быхаўскі, Кіраўскі, Клімавіцкі, Клічаўскі, Касцюковіцкі, Краснапольскі, Крычаўскі, Круглянскі, Магілёўскі, Слаўгарадскі, Чавускі, Чэрыкаўскі. У зоне, пацярпелай ад ЧАЭС, апынулася 46 помнікаў архітэктуры, 576 помнікаў археалогіі, 63 брацкія магілы. Савет Міністраў звяртаўся да Міністэрства па надзвычайных сітуацыях і абароне насельніцтва за фінансавай дапамогай (долевым удзеле ў рэстаўрацыі нерухомых гісторыка-культурных каштоўнасцей) у межах дзеяння праграмы па мінімізацыі і пераадоленні наступстваў Чарнобыльскай катастрофы на 1996 – 2000 гг. Аднак атрымаў адмову па прычыне фінансавання толькі жыллёва-камунальнага будаўніцтва [11, л. 116]. У канцы 1990 г. сумесна Гомельскім і Магілёўскім аблвыканкамамі пры ўдзеле Міністэрства культуры былі створаны камісіі па абследаванні стану і распрацаваны мерапрыемствы па захаванні нерухомай спадчыны населеных пунктаў, якія пацярпелі ад аварыі на ЧАЭС. У выніку правядзення выратавальных экспедыцый па адселеных вёсках у экспазіцыйны сектар "Падняпроўе" Беларускага дзяржаўнага музея архітэктуры і побыту былі перавезены будынкі з в. Бракава Слабада (Чавускі раён), ветраны млын з в. Зелянец (Хоцімскі раён). У зоне радыёактыўнага забруджвання Магілёўскай вобласці ў першыя гады праводзілася дэзактывацыя ўсіх жылых, грамадскіх, адміністрацыйных і гаспадарчых будынкаў, ажыццяўляўся вялікі аб'ём работ па добраўпарадкаванні населеных пунктаў [12, с. 542].

Ахову нерухомай спадчыны Магілёўскай вобласці курыравала Галоўнае ўпраўленне архітэктуры і горадабудаўніцтва і ўпраўленне культуры і інфармацыі. Пастановай Савета Міністраў ад 17.01.1991 г. было ўтворана ўпраўленне па рэстаўрацыі і кансервацыі помнікаў гісторыі і культуры Магілёўскай вобласці. Асаблівасцю арганізацыйна-кіраўніцкага механізму аховы нерухомых каштоўнасцей Магілёўшчыны стала стварэнне рамонтна-рэстаўрацыйных і праектных падраздзяленняў у структуры ўпраўлення па рэстаўрацыі. Да 2000-х гг. было сфарміравана 4 арганізацыі: "Магілёўрэстаўрацыя", УПКП "Цэнтр па рэстаўрацыі" камітэта па будаўніцтве, інвестыцыям і будаўнічай індустрыі аблвыканкама, ААТ "ЖАН", ППМ "ІКАН" (г. Мсціслаўль). У межах вобласці асноўны акцэнт па аднаўленні нерухомай спадчыны быў зроблены на г. Магілёў і г. Шклоў. У апошнім з нагоды падрыхтоўкі да святкавання "Дажынак-99" быў праведзены комплекс работ па Шклоўскай ратушы са сродкаў рэспубліканскага бюджэту, а рамонтныя работы ў іншых гарадскіх аб'ектах фінансаваліся з мясцовага бюджэту [13, с. 19; 210, л. 20]. Для ажыццяўлення рэстаўрацыі рыхтавалася абласная і гарадская праграма "Спадчына", якая ўключала мерапрыемствы па аднаўленні і прыстасаванні аб'ектаў, развіццю культуры, сеткі музееў. Крокам на шляху аднаўлення спадчыны Магілёва стала прыняцце Саветам Міністраў пастановы "Аб зацвярджэнні праекта зон аховы гістарычнага цэнтра г. Магілёва" № 25 ад 19.10.2005 г. У ахоўную зону былі ўключаны тэрыторыя замку, гандлёвая плошча і вакольны горад (Стары горад) у межах вала XVII – XVIII стст. (вул. Камсамольская). Ахоўная зона была вызначана для захавання старажытнай вулічнай сеткі. У ахоўныя зоны культурнага пласта ўваходзяць бескурганны могільнік XII – XIII стст. на тэрыторыі існуючага парку імя Горкага; тэрыторыя гарадзішча I тысячагоддзя да н.э. - XIII ст.; урочышча Змееўка; тэрыторыі былых Задубровенскага, Траецкага і Пакроўскага пасадаў. Усяго на тэрыторыі абласнога цэнтра налічваецца 56 нерухомых каштоўнасцей. Пераважная колькасць аб'ектаў была прынята да аховы ў 1998 г.[13; 12, с. 442].

У 1997 г. у структуры Магілёўскага аблвыканкама быў утвораны каардынацыйны савет па пытаннях захавання гісторыка-культурнай спадчыны. Падобны вопыт быў пераняты ў Брэсцкай вобласці [15]. Рашэннем Магілёўскага аблвыканкама № 2–8 ад 13 студзеня 2005 г. "Аб каардынацыйным савеце па пытаннях захавання гісторыка-культурнай спадчыны" быў сфарміраваны новы склад, які ўключаў 13 дарадцаў. Старшынёй савета быў прызначаны намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама А.Т. Глаз. Асноўныя функцыі падраздзялення ўключалі распрацоўку і разгляд перспектыўных і бягучых праграм па рэстаўрацыі, аднаўленні, рэканструкцыі, рэгенерацыі, навуковых даследаванняў і абследаванняў гісторыка-культурных каштоўнасцей і іх выкарыстанне; садзейнічанне Міністэрству культуры Рэспублікі Беларусь па ахове гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь у ажыццяўленні ім функцый па захаванні, аднаўленні і выкарыстанні гісторыка-культурных каштоўнасцей; разгляд і ўзгадненне праектаў рэстаўрацыі найбольш важных архітэктурных аб'ектаў, уключаных у Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей дзяржавы, рэстаўрацыі цэнтраў гістарычнай забудовы гарадоў і гарадскіх пасёлкаў вобласці; ажыццяўленне арганізацыйна-метадычнага кіраўніцтва дзейнасцю гарадскіх і раённых выканаўчых камітэтаў па захаванні матэрыяльнай і духоўнай спадчыны; разгляд прапаноў і заяў юрыдычных і фізічных асоб па паляпшэнні сістэмы аховы, захавання і папулярызацыі гісторыка-культурнай спадчыны і прыняцце мер па іх рэалізацыі. Ахова гістарычнай спадчыны ўключала аднаўленчыя работы на помніках архітэктуры, добраўпарадкаванне тэрыторый грамадскага карыстання, мемарыялізацыю памяці аб падзеях ВАВ [16; 14, с. 23]. Яскравай падзеяй у культурным жыцці горада стала аднаўленне страчанай архітэктурнай спадчыны – Магілёўскай ратушы, якая была знішчана ў 1957 г., адноўлена ў 2008 г. Падрыхтоўчыя работы расцягнуліся амаль на 16 гадоў. Сімвалічная закладка каменя адбылася ў 1992 г., толькі ў першай палове 2000-х гг. была падрыхтавана праектна-каштарысная дакументацыя. З апорай на архіўныя крыніцы за кароткі тэрмін з'явілася новая архітэктурная дамінанта – будынак на плошчы Славы. Будаўніцтва пачалося ў 2007 г. і скончана ў 2008 г. З моманту адкрыцця ў будынку размешчаны Музей гісторыі Магілёва. Улічваючы, што будынак з'яўляецца копіяй, законам ён не прыняты пад ахову і гісторыка-культурнай каштоўнасцю не з'яўляецца [17].

**Заключэнне.** Такім чынам, кіраўніцтва тэрытарыяльна-адміністрацыйных адзінак абірала ўласныя эканамічныя механізмы аховы і захавання нерухомай спадчыны. Напрыклад, у Мінскай вобласці мясцовыя ўлады

выступілі заснавальнікамі акцыянерных таварыстваў (“Стары Менск”, “Мінская спадчына”), стымулявалі прыцягненне сродкаў замежных інвестараў (беларуска-польскае прадпрыемства СП “Рэнаватум”), якое выконвала аднаўленчыя работы з далейшай здачай аб’ектаў у арэнду. Спецыфіка Магілёўскай і Гомельскай абласцей вызначалася ў дзейнасці вытворчых унітарных прадпрыемстваў у структуры аблвыканкамаў (“Гомельрэстаўрацыя”, “Магілёўрэстаўрацыя”). У Гомельскай вобласці практыкавалі прыцягненне пазабюджэтных сродкаў праз абвяшчэнне латарэй. Аналіз дакументаў Міністэрства культуры дазволіў меркаваць, што фінансаванне аднаўленчых работ Гомельскай і Магілёўскай абласцей адбывалася за кошт уласных абласных сродкаў. Недасканалы кантроль з боку улад за ходам аднаўленчых работ прыводзіў да страты аб’ектамі іх аўтэнтычнасці. Рэалізацыя мерапрыемстваў на лакальным узроўні ў межах горадабудаўнічай палітыкі спрыяла эстэтызацыі і добраўпарадкаванню населеных пунктаў і тэрыторый, прымушала карыстальнікаў і ўласнікаў нерухомых матэрыяльных каштоўнасцей да падтрымання іх у належным стане, садзейнічала акцэнтуацыі ўвагі на асобныя помнікі, архітэктурныя комплексы, гістарычную забудову як архітэктурныя дамінанты пэўнай лакацыі, папулярызацыі ведаў аб гісторыка-культурнай спадчыне, садзейнічала развіццю сацыяльнай, гарадской, турыстычнай інфраструктуры, добраўпарадкаванню тэрыторый грамадскага карыстання, тым самым аказвала станоўчае ўздзеянне на эканамічнае і культурнае аздараўленне населеных пунктаў краіны. Нерухомыя гісторыка-культурныя каштоўнасці, як аб’екты дзяржаўнай маёмасці, выступалі інструментам актывізацыі прадпрымальніцкай дзейнасці.

## ЛІТАРАТУРА


1. Дяржаўны архіў Мінскай вобласці (ДАМВ). – Ф. 2316. Воп. 5. Спр. 12.
2. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 7. Воп. 12. Спр. 666.
3. Мінская спадчына [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://spadchina.by/istoriya–predpriyatiya.html. – Дата доступа: 12.05.2019.
4. Андрейчик, Е.В. Охрана недвижимых историко-культурных ценностей в регионах Беларуси в 1990-е – начале 2000–х гг. (на примере Гродненской области) / Е.В. Андрейчик // Ученые записки Таврич. нац. ун-та им. В.И. Вернадского. Сер. Историч. науки. – 2020. – Т. 31(70), № 1. – С. 46–53.
5. НАРБ. – Ф. 7. Воп. 16. Спр. 3642.
6. Дзянісаў, У. Страсці вакол Малага гасцінага / У. Дзянісаў // Звязда. – 25 снежн. – 1999. – С. 3.
7. НАРБ. – Ф. 7. Воп. 16. Спр. 2549.
8. Чарнобыль: погляд праз дзесяцігоддзе / Пад рэд. Я.В. Малашэвіч. – Мінск : Беларус. Энцыкл., 1996. – 319 с.
9. Бородачева, Г.И. Вечно юный древний Гомель : контрольный текст экскурсии / Г.И. Бородачева. – Минск : УП «Национальное агентство по туризму». – 2008. – 54 с.
10. НАРБ. – Ф. 7. Воп. 12. Спр. 1194.
11. НАРБ. – Ф. 7. Воп. 12. Спр. 2257.
12. Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь / склад.: В.Я. Абламскі, І.М. Чарняўскі, Ю.А. Барысюк. – Мінск : БЕЛТА, 2009. – 684 с.
13. НАРБ. – Ф. 7. Воп. 16. Спр. 2548.
14. Володько, Л.А. Вдоль по Ленинской пройдем : контрольный текст экскурсии / Л.А. Володько. – Минск : УП «Национальное агентство по туризму», 2008. – 79 с.
15. Андрэйчык, К.В. Дзейнасць міжведамаснага каардынацыйнага савета па ахове матэрыяльнай і духоўнай спадчыны Брэсцкага абласнога выканаўчага камітэта (1997 – 2001 гг.) / К.В. Андрэйчык // Весн. МДУ ім. А.А. Куляшова. Сер. А, Гуманіт. навукі. – 2020. – № 1(55). – С. 46–53.
16. Андрэйчык, К.В. Ахова і выкарыстанне матэрыяльных нерухомых помнікаў гісторыі і культуры ў Рэспубліцы Беларусь у 1991 – 2001 гг.: планаванне і мерапрыемствы мясцовых улад / К.В. Андрэйчык // Романовские чтения – 13 : сб. ст. междунар. научн. конф., посвящ. 105-летию МГУ им. А.А. Кулешова, Могилев, 25–26 окт. 2018 г. / под общ. ред. А.С. Мельниковой. – Могилёв : МГУ им. А.А. Кулешова, 2019. – С. 110–111.
17. О координационном совете по вопросам сохранения историко-культурного наследия [Электронный ресурс] : решение Могилев. обл. исполн. ком., 13 янв. 2005 г., № 2–8 // Право. Законодательство Республики Беларусь. – Режим доступа: http://pravo/dcm03317.htm. – Дата доступа: 25.03.2018.


*Паступіў 12.11.2020*

## ADMINISTRATIVE APPROACHES TO THE PROTECTION OF IMMOVABLE MATERIAL HISTORICAL AND CULTURAL VALUES IN 1991-2006 (ON THE EXAMPLE OF THE MINSK, MOGILEV, GOMEL REGIONAL EXECUTIVE COMMITTEES)

***K. ANDREICHYK***

*Examines the practical experience of government management of the regional territorial level of governance for the protection of immovable material historical and cultural values, the specificity of administrative-economic mechanisms of protection and implementation of measures for the conservation, maintenance and rational use of monuments of civil and industrial architecture.*

***Keywords:*** *government bodies, legislation, state regulation, state policy, historical and cultural values.*